# КРЫНІЦЫ ВЫВУЧЭННЯ ЗАМЕЖНАЙ АДУКАЦЫІ МАГНАТАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў РАННІ НОВЫ ЧАС

***А. І. Калтачэнка***

*Рэспубліканскага інстытуту вышэйшай школы, вул. Маскоўская, 15, 220007, г. Мінск, Беларусь, koltachenkoalina@gmail. com*

У ранні Новы час магнаты Вялікага Княства Літоўскага мелі цікавасць да замежнай адукацыі. Спачатку дзяцей вучылі дома, пасля адпраўлялі ў школу, а ў 16–18 год выпраўлялі ў еўрапейскія ўніверсітэты. Адукацыйнае падарожжа было значнай падзеяй у жыцці магната, таму засталося шмат разнайстайных крыніц для вывучэння гэтай з'явы: метрыкі ўніверсітэтаў, лісты, бацькоўскія інструкцыі, дыярыушы, тэстаменты і г. д. Кожная крыніца мае сваю спецыфіку і дапамагае даведацца пра пэўныя асаблівасці з'явы замежнай адукацыі магнатаў Вялікага Княства Літоўскага.

***Ключавыя словы:*** замежная адукацыя; магнаты Вялікага Княства Літоўскага; гістарычныя крыніцы; адукацыйныя падарожжы.

# ИСТОЧНИКИ ИЗУЧЕНИЯ ЗАРУБЕЖНОГО ОБРАЗОВАНИЯ МАГНАТОВ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО В РАННЕЕ НОВОЕ ВРЕМЯ

***А. И. Колтаченко***

*Республиканского института высшей школыиания, ул. Московская, 15, 220007, Минск, Беларусь, koltachenkoalina@gmail. com*

В раннее Новое время магнаты Великого Княжества Литовского интересовались зарубежным образованием. Сначала детей учили дома, потом отправили в школу, а в 16–18 лет отправили в европейские университеты. Образовательное путешествие было значительным событием в жизни магната, поэтому существует множество различных источников для изучения этого явления: университетские метрики, письма, родительские инструкции, дневники, завещания и т. д. Каждый источник имеет свою специфику и помогает узнать об отдельных особенностях феномена зарубежного образования магнатов Великого Княжества Литовского.

***Ключевые слова:*** зарубежное образование; магнаты Великого Княжества Литовского; исторические источники; образовательные путешествия.

# SOURCES OF STUDY OF FOREIGN EDUCATION OF THE MAGNATES OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE EARLY MODERN PERIOD

***A. I. Kaltachenka***

*Republican Institute of Higher Education, st. Moskovskaya, 15, 220007, Minsk, Belarus, koltachenkoalina@gmail. com*

In earlier modern period, the magnates of the Grand Duchy of Lithuania were interested in foreign education. At first, the children were taught at home, then they were sent to school, and at the age of 16–18 they were sent to European universities. The educational journey was

a significant event in the life of the tycoon, so there are many different sources for studying this phenomenon: university metrics, letters, parental instructions, diaries, wills, etc. Each source has its own specifics and helps to learn about certain features of the phenomenon of foreign education of tycoons The Grand Duchy of Lithuania.

***Key words:*** foreign education; magnates of the Grand Duchy of Lithuania; historical sources; educational journey.

У ранні Новы час магнаты разумелі, што выхаванне і адукацыя маладых людзей неабходная і важная з’ява. Пры гэтым акцэнт у разважаннях наконт неабходнасці адукацыі рабіўся не на персанальных перавагах, а на карысці добраадукаванага чалавека для краіны [1, с. 389]. Увага да тэмы была значнай, шматлікія замежныя і мясцовыя аўтары пісалі свае заўвагі і парады, выпрацоўвалі найлепшыя варыянты атрымання адукацыі [1, с. 217–210; 2, с. 175–244]. У выніку склаўся ідэальны варыянт магнацкай адукацыі, які ўключаў некалькі этапаў: адукацыя дома, працяг у мясцовай школе і выезд за мяжу для адукацыі ў Еўропе. Еўрапейскае падарожжа з мэтай адукацыі ўключала наведванне цікавых універсітэцкіх лекцый, прыватныя заняткі, азнаямленне з жыццём каралеўскіх двароў, самапрэзентацыю і г. д.

Магнаты выпраўляліся ў замежнае адукацыйнае падарожжа на тры – пяць гадоў. Зразумела, што такая падзея пакідала пасля сябе пэўную колькасць розных дакументаў, якія зараз можна выкарыстоўваць для вывучэння замежнай адукацыі магнатаў ВКЛ. Гэта дакументы, якія пісаліся да выпраўлення ў падарожжа, падчас яго і пасля, а таксама не спецыфічныя крыніцы, ў якіх можна знайсці патрэбныя звесткі. Асноўнымі крыніцамі для вывучэння з’явы замежнай адукацыі з’яўляюцца бацькоўскія інструкцыі, лісты, дыярыушы падарожжаў, метрыкі ўніверсітэтаў. Але ж сведчанні пра плануемае ці ўжо здзейсненнае падарожжа можна знайсці ў тэстаментах, панегірыках і г. д.

Першы тып крыніц, па якіх можна вывучаць з’яву замежнай адукацыі, гэта інструкцыі і павучанні бацькоў, напісаныя для дзяцей ці іх апекуноў напярэдадні падарожжа. Гэта асаблівы жанр педагагічнага пісьма, які пачаў ўзнікаць напрыканцы XVI ст., але найбольшая колькасць захаваўшыхся інструкцый напісана была ў XVII–XVIII стст. Як піша ў сваім даследаванні Дарота Жоландзь-Стжэльчык (Dorota Żołądź-Strzelczyk), практыка такіх інструкцый прыйшла з дзейнасці дваровых служб і пасольств. Пісанне інструкцый для ўраднікаў і паслоў адбілася на тым, што такія ж інструкцыі пачалі пісаць і для сваіх дзяцей [3, с. 61]. У XVII ст. інструкцыі былі падрабязнымі, складаліся з вялікай колькасці

практычных пунктаў, а ў XVIII ст. іх змест робіцца больш філасофскім і маральна-выхаваўчым.

У адрозненні ад тэарэтычных педагагічных прац, дзе выбітныя мысляры разважалі наконт неабходнасці адукацыі і давалі агульныя парады, інструкцыі і павучанні бацькоў мелі індывідуальны характар, пісаліся адрасна. Па іх магчыма прасачыць адносіны ў сям'і, характар маладога чалавека, які выпраўляецца ў падарожжа, асноўны напрамак педагагічнага мыслення, які панаваў у час напісання інструкцыі.

Пісалі інструкцыі з мэтай давесці да дзяцей і іх апекуноў свае пажаданні, паўплываць на тое, каб час падарожжа прайшоў найбольш карысна. Хутчэй за ўсё, асноўная частка такіх павучанняў была вуснай, але захавалася і невялікая колькасць напісаных дакументаў. Змест інструкцый складаўся з апісання абавязкаў апекуна; вызначаўся маршрут падарожжа, яго мэта; агучваліся пытанні рэлігійнага, патрыятычнага, маральнага выхавання; абавязкова частку інструкцыі адводзілі пад напаміны пра фізічныя практыкаванні, парады наконт здароўя; наказы пра тое, як весці сябе ў дачыненні да розных людзей падчас падарожжа; некаторыя падымалі і пытанні фінансаў [2, с. 17–18]. Такім чынам інструкцыі павінны былі дапамагчы маладому магнату і яго апекуну зарыентавацца ў новым месце, а бацькам давалі адчуванне, што яны неяк уплываюць на сына.

У асноўным інструкцыі пісалі бацькі для сыноў, але былі выпадкі, калі інструкцыі рыхтавалі жанчыны, асабліва іх колькасць павялічылася ў XVIII ст. Як заўважылі Дарота Жоландзь-Стжэльчык і Малгажата Ева Кавальчык (Małgorzata E. Kowalczyk), маткі пісалі інструкцыі ў тым выпадку, калі бацька не паспяваў напісаць інструкцыю да сваёй смерці [2, с. 13]. Выключна рэдка інструкцыі пісалі для дачок, так захавалася інструкцыя напісаная ў 1667 г. Багуславам Радзівілам для сваёй дачкі Людвікі Караліны: «Informacja panom ekonomom córki mej w testamencie specyfikowanym…» [4, с. 127–141]. Асаблівасць гэтай інструкцыі у тым, што пісалася яна таму, што Багуслаў Радзівіл разумеў, што жыццё яго скончыцца хутчэй, чым дачка вырасце. Таму Б. Радзівіл вызначыў асоб, якія павінны займацца выхаваннем Людвікі Караліны і звярнуў увагу на такія пытанні, як рэлігійнае выхаванне, веды, якія дачка павінна засвоіць, яе здароўе, гігіена і г. д. [2, с. 397–415].

Сярод захаваўшыхся інструкцый найбольшая колькасць была напісана Радзівіламі, што не дзіўна; у іх існавала традыцыя пісання такіх дакументаў, заснаваная яшчэ Мікалаем Крыштафам Радзівілам Сіроткай,

які напісаў для сваіх сыноў «Admonitorium» [5, с. 218–240]. Захаваўся комплекс з пяці лістоў і інструкцый Крыштафа Радзівіла, напісаных для сына Януша ў перыяд з 1622 па 1628 г. [2, с. 175–244], тры інструкцыі, напісаныя ў 1733 г. Ганнай з Сангушкаў Радзівіл для сына Гераніма Фларыяна [6, с. 370–430], інструкцыя самога Гераніма Фларыяна [7, с . 177–205], яго брата Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі, напісаная для гувернера сыноў у 1742–1743 гг. [8] і інструкцыя Караліны з Пацеяў Радзівіл, напісаная ў 1766 г. для сына Юрыя [7, с. 255–267].

Замежную адукацыю можна вывучаць і па дакументах, якія былі напісаны ўжо пасля выезда за межы Рэчы Паспалітай. Гэта лісты, дыярыушы, метрыкі ўніверсітэтаў, творы і навуковыя працы падарожнікаў.

Ліставанне паміж домам і падарожнікамі – адна з асноўных крыніц вывучэння з’явы замежнага падарожжа. Знаходжанне за межамі краіны моцна абмяжоўвала магчымасці абмена інфармацыяй, таму ліст быў зручным сродкам камунікацыі. Да нашага часу захавалася даволі значная колькаць такіх лістоў. Некаторыя з іх не раскрываюць нейкіх падрабязнасцей, але дазваляюць даведацца пра тое, што падарожжа адбылося. Напрыклад, пра замежнае падарожжа Мікалая Андрэя Паца вядома зусім няшмат дзякуючы лісту Крыштафа Паца, які быў апекуном Мікалая Андрэя, напісанаму старасце Ковенскаму 6 сакавіка 1675 г. [9, с. 240]. У лісце адсутнічае інфармацыя пра маршрут падарожжа ці нейкія іншыя падрабязнасці, ліст сведчыць хутчэй пра тое, што падарожжа скончыць не атрымалася, бо маладога чалавека выклікалі дадому каб уладкаваць яго шлюб, але гэта фактычна адзіная крыніца, па якой зараз можна даведацца, што Мікалай Андрэй Пац быў у Еўропе.

А вось ліставанне паміж Львом Сапегам і яго сынамі дазваляе дастаткова падрабязна праанalізаваць падарожжы Яна Станіслава, Крыштафа Мікалай і Казіміра Льва, бо захавалася некалькі дзясяткаў лістоў, якія знаходзяцца ў архівах Украіны, Літвы і Польшчы [10, с. 320–324]. З лістоў можна даведацца пра тое, што турбавала бацьку, на што звярталі ўвагу падарожнікі, пра розныя здарэнні падчас падарожжа, рысы характару тых, хто ліставаўся і адносіны паміж імі і г. д. Так, дзякуючы лісту ад 30 снежня 1621 г. вядома, якія навукі Крыштаф Мікалай і Казімір Леў Сапегі вывучалі ў Мюнхене [11], ці як Леў Сапега хваляваўся за бяспеку сваіх сыноў (ліст ад 5 лютага 1622 г.) [12]. Праз лісты вырашаліся і фінансавыя пытанні, так Юры Алелькавіч скардзіўся сваёй маці на фінансавыя складанасці [13].

Цікавымі крыніцамі з'яўляюцца дыярыушы і дзённікі, напісаныя падчас падарожжа. Дыярыушы маглі пісаць штодзенна, калі падарожнік запісваў свае ўраджанні, як напрыклад рабіў Юры Радзівіл падчас падарожжа ў Італію ў 1575 г. [14]. Маглі пісаць толькі невялікія нататкі, а вялікі дыярыуш пісалі ўжо пасля вяртання. У дыярыушах можна ўбачыць, што было цікава падарожнікам, што іх здзіўляла, на што яны звярталі ўвагу: касцёлы і замкі, асаблівасці сельскай гаспадаркі, розныя інжынерныя дасягненні, прыватныя калекцыі розных цудаў (напрыклад прыватныя заапаркі), сады і г. д. Значнае месца ў дыярыушах займала апісанне шляхоў і маршрутаў падарожжа, а таксама апісанне гарадоў і вёсак, якія сустракаліся на шляху. Добры прыклад дыярыуша, галоўнае месца ў якім займае лаканічнае апісанне маршрута і месцаў, якія падарожнік наведвае – гэта дыярыуш падарожжа 1684–1687 гг. Караля Станіслава Радзівіла [15]. Яшчэ адным прыкладам цікавага, нешматслоўнага дыярыуша працяглага падарожжа з’яўляецца дыярыуш сына Караля Станіслава – Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі [16, s. 70–151].

Маршрут падарожжа дапамагаюць даследаваць метрыкі еўрапейскіх універсітэтаў. У XVI–XVIII стст. еўрапейскія ўніверсітэты вялі спецыяльныя кнігі, якія мелі назву метрыкі ці альбомы. Гэтыя кнігі змяшчалі імёны студэнтаў, якія былі залічаны на ўніверсітэцкія курсы. Такі запіс быў сведчаннем таго, што студэнт прыняў прысягу, аплаціў узнос і атрымаў дазвол карыстацца правамі і прывілеямі студэнта, акрамя таго запіс меў пэўнае юрыдычнае значэнне. Таму не дзіўна, што метрыкі старанна захоўвалі і даволлі шмат з іх захавалася да нашага часу, нягледзячы на розныя катаклізмы.

Адной з галоўных складанасцей працы з метрыкамі з’яўляюцца памылкі ў запісаных прозвішчах і датах. З кожным новым перавыданнем метрык прозвішчы выпраўляюцца, але ўсё роўна трэба ўважліва праглядаць спісы. Наконт дат пытанне яшчэ складаней, бо не толькі пры запісе магла быць памылка, але і гісторыкі лічаць, што дата запісу ў метрыку, гэта дзень, у які малады чалавек прыехаў у горад, ці наступны за ім дзень. Але гэта зусім не абавязкова так: не было абавязка прыйсці да ўніверсітэту адразу па прыезду. У Інгальштаце і Страсбургу давалі восем дзён на гэта, у Фрыбургу да пятнаццаці і г. д. [17, с. 43]. Існуе і іншая складанасць – не ўсе студэнты былі іматрыкуляваны, нават у той час, калі за гэта маглі накласці кару, а частка прозвішчаў магла згубіцца, бо першапачаткова запісы рабіліся на картках, а потым пераносіліся ў кнігі і

альбомы. А былі выпадкі, калі ў метрыкі запісваліся людзі, якія не былі студэнтамі. Так, у лейдэнскую метрыку запісаўся Януш Радзівіл з усёй сваёй світай, якая складалася з пятнаццаці чалавек, але ж зразумела, што не ўсе з іх наведвалі лекцыі [18, с. 234].

Але ж нягледзячы на ўсе складанасці, метрыкі еўрапейскіх крыніц застаюцца добрай крыніцай па даследаванню замежнай адукацыі, тым больш універсітэты перыядычна выдаюць альбомы даўніх метрык, што спрашчае даследаванні.

Яшчэ адной з даступных гісторыкам крыніц з’яўляюцца тэстаменты. Тэстаменты пісалі для вырашэння маёмасных пытанняў, матэрыяльнага забеспячэння нашчадкаў і г. д. Сярод матэрыяльных пытанняў перыядычна сустракаліся і запісы наконт будучыні дзяцей, іх выхавання і адукацыі. Часцей за ўсё на гэты конт сустракаюцца такія запісы, як «даць прыстойную адукацыю», без аніякіх удакладненняў. Напрыклад, Павел Кароль Сангушка пісаў : «…не паспею даць ім адукацыю, прашу жонку маю, каб належна іх стану дала ім выхаванне…» [19, с. 40]. Аднак ёсць невялікая колькасць тэстаментаў, у якіх былі прапісаны пэўныя маршруты адукацыйнага падарожжа, патрабаванні выправіць сына ў пэўную школу ці ўніверсітэт, ці былі прапісаны грашовыя сумы, якія бацька патрабаваў вылучыць на адукацыю.

У якасці прыкладаў тэстаментаў, у якіх падымалася пытанне замежнай адукацыі, можна прывесці наступныя. Крыштаф Радзівіл Пярун у тэстаменце ад 4 жніўня 1599 г. напісаў даволі падрабязныя патрабаванні наконт адукацыя сына Крыштафа Радзівіла: да выезда за мяжу вывучыць лацінскую і нямецкую мовы, паехаць у Лейпцыг, і толькі потым далей. Прапанаваў выправіць сына і ў Францыю, калі там будзе спакойна і бяспечна, а вось у Італію прапанаваў не ехаць (традыцыйнае патрабаванне Радзівілаў біржанскай лініі). Былі напісаны прапановы па таму, хто павінен суправаджаць Крыштафа Радзівіла ў падарожжы, колькі падарожжа павінна працягвацца і г. д. [20, с. 95–96].

Ці тэстамент Крыштафа Паца, напісаны 20 лістапада 1678 г., у якім падрабязна прапісаны планы на працяг адукацыйнага падарожжа (на момант напісання тэстамента яно ўжо адбывалася) Казіміра Міхала Паца, якога ён апекаваў пасля смерці бацькі [9].

Існуюць і іншыя крыніцы, па якіх можна вывучаць замежнае падарожжа. Гэта розныя фінансавыя дакументы (вэксалі і чэкі, сведчанні запазычанняў і даўгоў, справаздачы па выдатках), пашпарты, дазваленні

на праезд па пэўнай тэрыторыі, творы і працы вучня (вершы, прамоцыі, навуковыя працы), альбомы сяброў ці Album Amicorum, панегірыкі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Skoczek J. Wybór pism pedagogicznych Polski doby Odrodzenia. Wrocław : Zakład im. Ossolińskich, 1956. 534 s.
2. Żołądź-Strzelczyk D., Kowalczyk M. E. Ojcowskie synom przestrogi : instrukcje rodzicielskie (XVI–XVII w.). Lutynia : Chronicon, 2017. 580 s.
3. Żołądź-Strzelczyk D. Peregrinatio academica. Studia młodzieży polskiej z Korony i Litwy na akademiach i uniwersytetach niemieckich w XVI i pierwszej połowie XVII wieku. Poznań : Wyd-wo naukowe Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza w Poznaniu, 1996. 241 s.
4. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (AGAD). Archiwum Radziwiłłów (AR). Dział XI. nr. 51.
5. AGAD. AR. Dział XI. nr. 87.
6. AGAD. AR. Dział XI. sygn. 136.
7. Żołądź-Strzelczyk D., Kowalczyk M. E. Przestrogi i nauki dla dzieci : instrukcje rodzicielskie (XVIII w.). Lutynia : Chronicon, 2017. 463 s.
8. AGAD. AR. Dział VI. sygn II–80a.
9. Wolff J. Pacowie: materyjały historyczno-genealogiczne. Petersburg: F. Suszczyńskiego, 1885. 377 s.
10. Goszczyński. A. Korespondencja jako źródło do badań nad podróżami edukacyjnymi synów Lwa Sapiehy // Źródła do dziejów staropolskich podróży edukacyjnych / (pod red.) D. Żołądź-Strzelczyk i M. E. Kowalczyk. Wrocław. Chronicon, 2017. 423 s.
11. Львоўская нацыянальная навуковая бібліятэка Украіны ім. В. Стэфаніка (ЛННБУ). Ф. 103. Воп. 1. Спр. 235. К. 1–1v.
12. ЛННБУ, Ф. 103. Воп. 1. Спр. 246. К. 1–1v.
13. Скеп'ян А. А. Лісты маладых князёў Алелькавічаў з Італіі // Архіварыус. 2009. Вып. 7. С. 55–74.
14. Modlińska-Piekarz A. Dziennik podróży do Włoch Jerzego Radziwiłła w 1575 roku // Kultura i Historia. Tom 21 (2012). [Electronic resource]. – Mode of access: https://www. kulturaihistoria. umcs. lublin. pl/pl/archives/3856. – Date of access: 01. 11. 2021.
15. Radziwiłł K. S. Diariusz peregrynacji europejskiej (1684–1687) / oprac., wstępem i koment. opatrzył Adam Kucharski. Toruń. Wyd-wo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 2011. 302 s.
16. AGAD. AR. Dział VI. II–80a.

17. Chachaj M. Metryki zagranicznych uniwersytetów i akademii jako źródło do dziejów kultury polskiej (XVI–XVII w.) // Studia z dziejów epoki renesansu / (pod red.) Henryka Zinsa. Warszawa : PWN, 1979. 283 s.

18. Album studiosorum Academiae Lugduno Batavae 1575–1875 // https://books. google. com [Electronic resource]. Mode of access: https://books. google. pl/books?id=LntWAAAAcAAJ&printsec=frontcover&hl=ru#v=onepage&q&f=false. – Date of access: 01. 11. 2021.

19. Marszalska J. M., Graczyk W. Testamenty książąt Lubartowiczów-Sanguszków. Wybór tekstów źródłowych z lat 1750–1876. Kraków : WITKM, 111 s.

20. Augustyniak U. Testamenty ewangelików reformowanych w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI–XVIII wieku. Warszawa : Semper, 2014. 300 s.